# *Падымалісь чорны хмары...*
# *(Абарона Крычава)*

*Народная балада 13-16 ст.*




*Падымалісь чорны хмары неба пакрывалі,*
*Чорны хмары неба пакрывалі,*
*Прыхадзілі злы татары ды пад Крычаў сталі,*
*Злы татары ды пад Крычаў сталі.*

*Запалілі стары Крычаў вежы запылалі*
*Вежы запылалі, запылалі;*
*Стары Крычаў падымаўся людзі ў рады сталі,*
*Падымаўся людзі ў рады сталі.*

*Палілася кроў змяшалась з чорнаю зямлёю,*
*Кроў змяшалась з чорнаю зямлёю,*
*Злы татары падаліся уцякаць гурбою,*
*Падаліся уцякаць гурбою.*

© Stary Olsa